# АД ДЭЎЛІНА ДА АНДРОСАВА: АДЛЮСТРАВАННЕ АДНОСІН РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ І РАСІІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

**А. В. Дземідовіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, dzemidovich@bsu.by*

У артыкуле разглядаецца беларуская гістарыяграфія ўзаемаадносін Рэчы Паспалітай і Расійскай дзяржавы ў 1618–1667 гг.: ад Дэўлінскага пагаднення да Андросаўскага перамі'я. Аўтар аналізуе, якім чынам падзеі гэтага перыяду ацэньваліся беларускімі гісторыкамі, пачынаючы ад вытокаў беларускай гістарыяграфіі і да сучаснасці.

***Ключавыя словы:*** беларуская гістарыяграфія; вайна; знешняя палітыка; перамір'е; Расія; Рэч Паспалітая.

# FROM DEULIN TO ANDRUSOVO: REPRESENTATION OF RELATIONS BETWEEN THE POLISH-LITHUANIAN COMMONWEALTH AND RUSSIA IN BELARUSIAN HISTORIOGRAPHY

**A. V. Dzemidovich**

*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, dzemidovich@bsu.by*

The article examines the Belarusian historiography of the relationship between the Polish-Lithuanian Commonwealth and the Russian state in 1618–1667, from the Truce of Deulino to the Truce of Andrusovo. The author analyzes how the events of this period were evaluated by Belarusian historians, starting from the origins of Belarusian historiography and up to the present.

***Key words:*** Belarusian historiography; war; foreign policy; truce; Russia; the Polish-Lithuanian Commonwealth.

У якасці прадмета даследавання ў дадзеным артыкуле выступае беларуская гістарыяграфія ўзаемаадносін Рэчы Паспалітай і Расійскай дзяржавы ў перыяд 1618–1667 гг. Мэтай з'яўляецца выяўленне асаблівасцей адлюстравання ўзаемаадносін дзвюх дзяржаў у пазначаны перыяд у беларускай гістарыяграфіі.

З заканчэннем інтэрвенцыі Рэчы Паспалітай у Расійскую дзяржаву 1609–1618 гг. пачынаецца новы этап у гісторыі дзяржавы абодвух наро-

даў, які характарызуецца стратай ініцыятывы Рэчы Паспалітай у знешняй палітыцы, прынамсі, у адносінах з усходнім суседам. 1667 г. – год падпісання Андросаўскага перамір'я, якое завяршыла зацяжную вайну. У гэты перыяд (1618–1667 гг.) укладваюцца дзве вайны паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй – Смаленская 1632–1634 гг., вайна 1654–1667 гг.; казацка-сялянская вайна (з шэрагам знешнепалітычных аспектаў); міжваенныя перыяды, напоўненыя супярэчнасцямі, якія вынікалі з папярэдніх канфліктаў.

Знешнепалітычная гісторыя Рэчы Паспалітай XVII ст. у сілу розных прычын пазбаўлена належнай даследчыцкай увагі. Так, яна не стала асобным прадметам зацікаўленасці заснавальнікаў беларускай гістарыяграфіі; у савецкія часы разглядалася і трактавалася праз прызму адпаведных ідэалагічных установак; на сучасным этапе адбыўся зварот да пэўных тэм і сюжэтаў, аднак гэты перыяд па-ранейшаму саступае іншым у ступені распрацаванасці.

Аўтар паспрабаваў у храналагічнай паслядоўнасці вызначыць характэрныя рысы асвятлення праблемы – узаемаадносін Рэчы Паспалітай і Расійскай дзяржавы ў 1618–1667 гг. – у беларускай гістарыяграфіі.

Адным з першых беларускіх даследчыкаў, які ў сваёй працы, сярод іншага, закранаў пытанні знешнепалітычнага характару, быў У. М. Ігнатоўскі. У "Кароткім нарысе гісторыі Беларусі" падзеі XVII ст. разглядаюцца ў раздзеле, які прысвечаны трэцяму адпаведна перыядызацыі Ігнатоўскага, – польскаму перыяду гісторыі Беларусі. У параграфе "Агульны палітычны абгляд" аўтар коратка ўзгадвае Смаленскую вайну, звязвае карані вайны 1654–1667 гг. з казацкім рухам, на некалькіх старонках неаднаразова падкрэслівае негатыўны ўплыў і вынік для беларускай зямлі войнаў XVII ст. [1, с. 156–157].

Так, ацэньваючы Палянаўскі мір, які завершыў Смаленскую вайну, У. М. Ігнатоўскі піша: "Здаволілася Польшча, здаволілася і Масква, але аб інтарэсах знішчанай Беларусі ніхто не паклапаціўся" [1, с. 157].

Пра вайну 1654–1667 гг. сказана, што ў часы панавання Яна Казіміра Вазы і маскоўскага гаспадара Аляксея Міхайлавіча зноў пачаліся войны паміж Масквою і Рэччу Паспалітай, а руйнавалася паводле звычаю Беларусь, на тэрыторыі каторай ішло імперыялістычнае змаганне [1, с. 157]. Бачна ацэнка аўтара і спроба выявіць характар канфлікту.

Па сутнасці У. М. Ігнатоўскім была афармлена парадыгма, у рэчышчы якой паказваўся разбуральны характар войнаў 1632–1634 гг. і 1654 –1667 гг. Аднак яна аказалася перарванай у часе. І падобныя ацэнкі, але на падставе шырокай базы крыніц і гістарыяграфіі і іншай метада-

логіі, будуць артыкуляваццa ўжо гісторыкамі наступных пакаленняў, якія актыўна звернуцца да гэтай тэматыкі значна пазней, у 1990-х гг.

Варта ўзгадаць працу В. К. Шчарбакова "Сялянскі рух і казацтва на Беларусі ў эпоху феадалізма", на старонках якой разглядаюцца падзеі XVII ст. праз прызму класавай барацьбы. У адпаведным раздзеле "Сялянскі рух у часе вайны Маскоўскай дзяржавы з Польшчай" аўтар акрэсліў задачу, якую мела, на яго думку, Расія, пачынаючы канфлікт з Рэччу Паспалітай: "Як мінімум, Маскоўская дзяржава ставіла сваёй задачай захват Беларусі і Літвы і заваяванне адкрытага выхаду па Зах. Дзвіне ў Балтыйскае мора" [2, с. 70] Падкрэслівалася, што Беларусь павінна была прыняць на сябе ўдар варагуючых бакоў, пры гэтым адзначалася, што войны паміж дзяржавамі адбываліся ўжо не адзін раз. Акцэнтуецца ўвага, што міждзяржаўны канфлікт з'явіўся імпульсам выступлення сялянства супраць шляхты. Актывізацыяй сялянскага руху тлумачыцца шэраг рэчаў: прычына паражэння войск Рэчы Паспалітай, палітыка Масквы па "абароне мясцовых землеўласнікаў" і інш., адзначаецца марадзёрства маскоўскіх і польскіх войск [2, с.101–104]. Заўважым, што пазіцыя В. К. Шчарбакова – ацэнка палітыкі Расіі адносна зямель Рэчы Паспалітай – пазней падверглася крытыцы Л. С. Абецэдарскага [3, с. 144].

Іншая парадыгма, у межах якой асэнсоўваліся падзеі XVII ст., тая, дзе вайна 1654–1667 гг. трактавалася як "барацьба за ўз'яднанне з Расіяй," пачала фарміравацца ў 1950-я гг. Такія погляды доўгі час выразна агучваліся на старонках пэўных раздзелаў выданняў, якія прапаноўвалі афіцыйны выклад гісторыі [4; 5], а таксама ў асобных працах Л. С. Абецэдарскага, дзе падкрэсліваўся класавы і "нацыянальна-вызваленчы" характар канфлікту [3; 6; 7].

Так, у першай абагульняючай працы па гісторыі Беларусі, якая падсумавала даследаванні гісторыкаў у пасляваенныя гады [4], знешняя палітыка Рэчы Паспалітай адзначанага перыяду разглядаецца ў межах главы "Вызваленчая вайна беларускага народа. Барацьба за ўз'яднанне Беларусі з Рускай дзяржавай у сярэдзіне XVII в.", аўтарам якой з'яўляецца ўжо згаданы Л. С. Абецэдарскі. У раздзеле "Вайна з Рэччу Паспалітай за ўз'яднанне Украіны і Беларусі з Расіяй" прычыны вайны 1654–1667 гг. выводзяцца з Пераяслаўскай рады 1654 г., а дакладней – разглядаюцца як яе наступствы. Паводле аўтара раздзела: "польскія паны не жадалі змірыцца са стратай украінскіх зямель. Вайна з Рэччу Паспалітай была непазбежнай" [4, с. 181]. У выданні неаднаразова сцвярджаецца аб падтрымцы Расіі сялянствам і нізамі гарадскога насельніцтва, сдачы расійскім войскам без боя многіх беларускіх гарадоў. Вызначаецца характар змагання: барацьба беларускага сялянства супраць "феадальна-прыгонніцкага гнёту", гарадскога насельніцтва – супраць "панскага гнё-

ту” і супраць “эксплуататарскай вярхушкі” [4, с. 184–185]. Асобная ўвага ўдзяляецца знешняму фактару – агрэсіі Швецыі, – які час ад часу карэктаваў ход канфлікту паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй. Тэрміналогія, якая прымянялася аўтарам раздзела да вызначэння падзей сярэдзіны XVII ст. наступная: вайна 1654–1667 гг. называецца “барацьбой за ўз’яднанне Беларусі з Рускай дзяржавай”, “вайной з Рэччу Паспалітай за ўз’яднанне Украіны і Беларусі з Расіяй”, “руска-польскай вайной”. Знешнепалітычныя аспекты аўтарам звязваюцца з унутрыпалітычным кантэкстам, абазначаным як “барацьба класавых групіровак у Беларусі”.

Ідэнтычныя погляды знайшлі месца на старонках першага тома пяцітомнага выдання “Гісторыя Беларускай ССР” [5, 305–328].

Распад СССР, станаўленне суверэннай Беларусі абумовілі новыя падыходы да трактоўкі падзей гісторыі Беларусі ў цэлым, і знешнепалітычнай гісторыі ў прыватнасці. У 1994 г. выходзіць першы том акадэмічных “Нарысаў гісторыі Беларусі”. Аднак падзеі XVII ст. у ім аналізаваліся неяк выбарачна: па-за ўвагай аўтараў застаўся шэраг знешнепалітычных канфліктаў, у якія тым ці іншым чынам была ўцягнута Рэч Паспалітая. Аўтарам раздзела “Войны і ўнутрыпалітычныя канфлікты сярэдзіны XVII–XVIII ст.” з’яўляецца В. І. Мялешка. Пры разглядзе вайны 1654–1667 гг. не называюцца яе прычыны і мэты. Падзеі ж першай трэці XVII ст. – Ілжэдзмітрыяда, інтэрвенцыя 1609–1618 гг., Смаленская вайна 1632–1634 гг. – дзе, у прынцыпе, варта шукаць перадумовы трынаццацігадовай вайны ўвогуле не ўзгадваюцца ў выданні. Падрабязна разгледжаны ход ваенных дзеянняў, эвалюцыя настрояў насельніцтва Рэчы Паспалітай: ад падтрымкі Расіі і пераход на яе бок да аказання ёй супраціўлення [8, с. 208–228]. Неаднаразова падкрэслены спусташэнне і разрабаванне, што здзяйснялася расійскімі войскамі [8, с. 217, 222, 224]. Звернута ўвага на “гвалтоўнае перасяленне беларускага насельніцтва ў Расію” [8, с. 218], што супярэчыць тэзісу Л. С. Абецэдарскага аб добраахвотным перасяленні выхадцаў з Беларусі ў Расію ў гэты час [6, с. 7]. Дадзена ацэнка вынікам падзей 1650–1660-х гг. для Беларусі: скарачэнне колькасці насельніцтва ў выніку натуральных страт і палону, запусценне зямель, падрыў эканомікі [8, с. 218].

Значнай з’явай у беларускай гістарыяграфіі з’явілася выданне манаграфіі Г. М. Сагановіча “Невядомая вайна: 1654–1667” [9], у якой даследуецца міждзяржаўны канфлікт: удзелена ўвага ваенным кампаніям, настроям грамадства, палітыцы Расіі на беларускіх землях. Аўтар ацэньвае падзею як адну з найбольш драматычных у гісторыі Беларусі, апісвае ўрон, які панеслі беларускія землі падчас яе. Гэта была першая праца, дзе з’ява знешнепалітычнага характару вылучана ў асобны аб’ект даследавання, што было абсалютна не характэрна для гістарыяграфіі папярэдніх

часоў. Асвятленне адносін паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй знайшло ўвасабленне ў іншых працах даследчыка [10–11]. У “Нарысе гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст.” у раздзеле пад назвай “Ад велічы да заняпаду” аўтарам прасочана гісторыя міждзяржаўных стасункаў – Рэчы Паспалітай і Расіі – ад пачатку XVII ст. і да Андросаўскага пермір’я. Такім чынам, прадстаўлена панарамнае бачанне знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай, дзе праз узаемасувязь падзей можна зразумець матывы бакоў – удзельнікаў канфліктаў. Даследчыкам удзелена ўвага Смаленскай вайне, пра якую беларускімі гісторыкамі пісалася вельмі мала [11].

У абагульняючай 6-томнай працы “Гісторыя Беларусі” ў раздзеле “Беларусь у сярэдзіне XVII – першай палове XVIII ст.” паказаны спусташальны характар войнаў адзначанага перыяду. Аўтар параграфа “Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654 – 1667 гг.” Г.М. Сагановіч адзначае акупацыйны характар палітыкі царскіх улад на беларускіх землях, прымусовы вывад мясцовага насельніцтва ў Маскоўскую дзяржаву, актыўны характар народнага супраціўлення на беларускіх землях [12, с. 83–85; 90]. Падводзячы вынікі канфлікту, аўтар называе яго ваеннай катастрофай для Беларусі [12, с.93].

У 2003–2004 гг. з’явіўся двухтомны вучэбны дапаможнік У. Е. Снапкоўскага, прысвечаны гісторыі знешняй палітыкі Беларусі ад знешнепалітычных стасункаў старажытнабеларускіх дзяржаў-княстваў да дзейнасці Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне. У першым томе дапаможніка разглядаюцца знешняя палітыка і знешнепалітычны механізм Рэчы Паспалітай, у тым ліку і войны XVII ст [14]. Дадзенае выданне – адзіная абагульняючая праца ў беларускай гістарыяграфіі па гісторыі знешняй палітыкі розных форм беларускай дзяржаўнасці. Акрамя асвятлення падзей дыпламатычнай практыкі і ваенных дзеянняў, аўтар вылучае “літоўскі фактар” у адносінах Рэчы Паспалітай з Расіяй, негатыўна ацэньвае вынікі і наступствы канфліктаў для Беларусі.

Падводзячы вынік, можна сказаць, што палітычная гісторыя зведала на сабе адбітак ідэалогіі савецкіх часоў, калі шматлікія тэмы і сюжэты заставаліся па-за фокусам даследчыцкай увагі, а тыя якія даследаваліся – інтэрпрэтаваліся ў адведным ідэалагічным рэчышчы. Доўгі час знешняя палітыка Рэчы Паспалітай, альбо проста падзеі, у вір якіх была ўцягнута гэта дзяржава, не былі аб’ектам увагі гісторыкаў. Да сучаснага стану даследавання гэтай праблематыкі характэрны наступныя рысы: зварот да асобных падзей, пры якім больш увагі адведзена вайне 1654–1667 гг. (наяўнасць манаграфічнага даследавання), значна менш – Смаленскай 1632 –1634 гг. Амаль па-за ўвагай засталіся міжваенныя перыяды.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Ігнатоўскі У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск : Беларусь, 1992.
2. *Шчарбакоў, В. К.* Сялянскі рух і казацтва на Беларусі ў эпоху феадалізму. Мінск: б.в., 1935.
3. *Абецедарский Л. С.* Белоруссия и Россия. Очерки русско-белорусских связей второй половины XVI – XVII в. Минск : Вышэйшая школа, 1978.
4. История Белорусской ССР : в 2 т. / Акад. наук БССР, Ин-т истории. – Минск : Изд-во АН БССР, 1961–1962. – Т. 1. / редкол.: Л.С. Абецедарский [и др.]. – 1961. – 655 с.
5. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. Мінск : Навука і тэхніка, 1972. Т. 1 : Першабытнаабшчынны лад на тэрыторыі Беларусі. Эпоха феадалізму.
6. *Абецедарский Л. С.* Белорусы в Москве. Минск : Издательство Белгосуниверситета имени В.И. Ленина, 1957.
7. *Абецедарский Л. С.* Борьба белоруссого народа за соединение с Россией (вторая половина XVI – XVII в.): Автореферат диссертации на соискание ученой степени доктора истроических наук. Минск, 1965.
8. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Мн. : Беларусь, 1994. Ч.1.
9. *Сагановіч Г.* Невядомая вайна: 1654-1667. Мн.: Навука і тэхніка, 1995.
10. *Сагановіч Г.* Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. Мн. : Энцыклапедыкс, 2001.
11. *Сагановіч Г.* Вайна на полацка-віцебскім рубяжы ў 1632–1633 гг. і «паўстанне» ў Полацку // Беларус. гіст. агляд. 2011. Т. 18, сш. 1–2. С. 21–42.
12. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Мінск : Экаперспектыва, 1994. Т.3. : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.)
13. *Снапкоўскі У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі : вучэб. дапам. для студэнтаў фак. міжнар. адносін : у 2 ч. Мінск: БДУ, 2003. Ч. 1 : Ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца XVIII ст.